**Тэма**. **Агульнаўжывальныя словы і словы абмежаванага ўжытку.**

**Мэта**: пазнаёміць вучняў з лексікай паводле сферы ўжывання, з групамі слоў лексікі абмежаванага ўжывання, дыялектнымі словамі, іх асаблівасцямі; выпрацоўваць навык бачыць дыялектныя словы ў тэксце, замяняць іх агульнаўжывальнымі; праверыць узровень засваення ведаў па тэме “Лексіка”; прывіваць любоў да роднага слова, да Радзімы.

Ход урока.

I. **Аргмомант.**

Добры дзень усім прысутным на ўроку. Спадзяюся, што сённяшні ўрок будзе плённым і карысным для ўсіх. Мы будзем працягваць працу па тэме “Лексіка” і пастараемся зноў адчуць мілагучнасць, яскравасць і хараство беларускай мовы. Мне хацелася б, каб кожны быў спакойны і ўпэўнены.

II. **Актуалізацыя ведаў па тэме “Лексіка”.**

- Які раздзел граматыкі называецца “Лексіка”?
- З якімі тэмамі ў раздзеле “Лексіка” мы ўжо пазнаёміліся?
- Што такое лексічнае значэнне слова?
- Што мы называем сінонімамі?
- Якія словы называюцца антонімамі?
- Якія словы называюцца амонімамі?

На тэлевізары дэманструюцца значэнні слоў:

**1)** Славуты – вядомы, папулярны.
Куфар – скрыня, якая служыць для захоўвання адзежы.
Срэбраны – зроблены са срэбра.
Валошка – тое ж, што і васілёк.

- Якім спосабам даецца тлумачэнне лексічнага значэння слоў?

**2)** Глядзіць у вокны дзіўны вечар.
Кладзецца змрок на цесны двор.
Мароз-мастак рукой старэчай
На шыбах піша свой узор.

- Назавіце словы, якія ўжыты ў пераносным значэнні?
- На аснове чаго адбыўся перанос?

**3)** Дык вось, калі падумаеш глыбей, прыгледзішся больш уважліва і пільна, дык аказваецца, што Радзіма – гэта і тыя добрыя людзі, з якімі ты ступіў у жыццё, якія заўсёды гатовы прыйсці табе на дапамогу і дзеля якіх сам гатовы на ўсё самае слаўнае і выдатнае і на ўсё самае скрушнае і цяжкае – нават на смерць.

- Назавіце сінонімы ў тэксце? Дапоўніце іх сваім прыкладам.
- Паразважайце аб тым, што значыць Радзіма для вас.

**4)** Хвілінка кемлівасці.
Знайдзіце пятае лішняе слова (дайце тлумачэнне):

- Верабей, сініца, бабёр, ластаўка, дзяцел.

- Студзень, люты, зіма, сакавік, красавік.
- Асіна, бяроза, таполя, рабіна, шыпшына.
- Панядзелак, аўторак, сёння, чацвер, пятніца.

-А што ж у дадзеных словах дапамагло змяніць лексічнае значэнне слоў?

- Л**ю**быя - люб**ы**я (сябры, пытанні)

- В**а**раны – віран**ы** (рак, конь)
- Густ**ы** – г**у**сты (дождж, розныя)

**III. Актуалізацыя раней вывучанага матэрыялу.**

Тлумачальная дыктоўка з заданнем(вучань ля дошкі):

Досвітак у вёсцы

Сонна і ціха заходзіў досвітак у хату. Ад вуліцы

перад хатай расла ніцая бяроза. У дупле яе жыла сям'я шпакоў. Гародчык ад вуліцы зарос густымі бэзавымі кустамі. Пад імі летам хаваліся ад гарачыні і купаліся ў пяску куры.

- Зрабіце сінтаксічны разбор першаага сказа.
- Індывідуальнае заданне. Фанетычны разбор слова "сям'я". (вучань ля дошкі)
- Арфаграфічная хвілінка. Якая арфаграма прысутнічае ў слове сям'я? Суаднясіце словы правага слупка з левым, згодна з вывучанымі правіламі:

| | |
|---|---|
| З'ехаць | Прэзідыум |
| Дзяўчынка | Аб'яднанне |
| Бацька | Льецца |
| Ілья | Пісьмо |
| Соус | Здароўе |
| Акварыум | Радыус |

- Назавіце словы, у якіх колькасць літар і гукаў не супадае.
- Назавіце словы, у якіх вымаўленне не супадае з напісаннем.

**IV. Новы матэрыял.**

**Настаўнік.** Мы запісалі з вамі тэкст пра досвітак у вёсцы. Ці любіце вы бываць у вёсцы? Ці зразумелі б вы, калі б мы запісалі ў канцы тэкста такі сказ: Каля іх бегалі жоўценькія курчаняты. Хто ж такія курчаняты? Якім словам, зразумелым для нас мы можам яго замяніць?

**Фізкультхвілінка.**

- Пакажыце пальцамі, яу бы вы сыпалі проса куранятам і як бы вы іх клікалі.
- Патрэніруем свае вочкі. Паглядзіце на малюнкі так, як я вам прадыктую 1-3-4-2.

**Настаўнік.** Сёння на ўроку мы даведаемся, што ўсе словы беларускай мовы падзяляюцца на агульнаўжывальныя і словы абмежаванага ўжытку.

**Зварот да схемы**




- Да якой групы слоў, на вашу думку, адносіцца слова курчаняты?
- Якія словы ўжыты ў сказах:
  Мама наварыла бульбы.
  Ужо картоплі пачыналі кіпець.
  Хірург узяў у рукі скальпель.
  Трэба добра ведаць флору і фаўну свайго краю.

**Зварот да правіла**. Старонка 72.

**V. Замацаванне.**

**1.** Практыкаванне 134. (Вусна)

- Чаму хлопчык не зразумеў бабулю?

**2.** Слоўнікавая работа.

Дыялект – мясцовая разнавіднасць мовы, гаворка. Група мясцовых гаворак, аб'яднаных агульнымі рысамі.

Гаворка – гэта разнавіднасць мясцовага дыялекту, якая ахоплівае адносна невялікую тэрыторыю (вёску ці раён).

Дыялекталогія – раздзел мовазнаўства, які вывучае дыялекты.

Дыялектолаг – спецыяліст у галіне дыялекталогіі.

**3.** Практыкаванне 135. (Вусна)

- Хто такі Іван Іванавіч Насовіч?

- Прыведеныя са слоўніка Насовіча словы адносяцца да агульнаўжывальных ці дыялектных?

**4.** Практыкаванне 136 (Пісьмова)

**5.** Практыкаванне 137 (Вусна)

**6.** Індывідуальнае заданне на дошцы. Здольны вучань выконвае заданне павышанай цяжкасці. Практыкаванне 138.

**7.** Творчае заданне (Падрыхтаваны загадзя вучань дэманструе на паперы сказы, у якіх ужываюцца дыялектныя словы. Падказка-малюнак на адваротным баку паперы)

На зялёнай лугавіне паважна ходзіць бацян.

Мама з лесу прынесла поўную карзіну паземак.

З лесу выйшаў магутны рагач і павольна агледзеў наваколле.

Тата паставіў леск і палез на яблыню здымаць яблыкі.

**VI. Падагульненне вывучанага.**

- Над якой тэмай працавалі сення?
- Якія словы называюцца агульнаўжывальнымі?
- Якія словы называюцца дыялектнымі?
- Ці ведаеце вы якія-небудзь дыялектныя словы?

**VII. Рэфлексія.**

Выберыце выраз, які адпавядае вашым адносінам да сённяшняга ўрока:

- Усё зразумеў, магу дапамагчы іншым.
- Нічога не зразумеў.
- Мне было цікава.
- Тэму сённяшняга ўрока я запомню надоўга.

Выберыце выраз, які адпавядае вашым адносінам да сённяшняга ўрока:

- Усё зразумеў, магу дапамагчы іншым.
- Нічога не зразумеў.
- Мне было цікава.
- Тэму сённяшняга ўрока я запомню надоўга.

**VIII. Дамашняе заданне.**

Практыкаванне 139. §19

Распытайце ў бацькоў, дзе яны вучыліся, кім працуюць, якія словы, звязаныя з умовамі сваёй працы, яны выкарыстоўваюць.